CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

MOB 2016

UZUPEŁNIA ZDAJĄCY

KOD | PESEL

miejsce na naklejkę

☐ dysleksja

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

DATA: **24 maja 2016 r.**
GODZINA ROZPOCZĘCIA: **9:00**
CZAS PRACY: **170 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 13 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-P1_1P-162

Układ graficzny
© CKE 2015

MOB 2016

**Заданне 1.**

Настасся Кахановіч

***МОДА НА ВЕГАНАЎ***

(скарочана)

[…] Мода на адмову ад мяса і іншых прадуктаў жывёльнага паходжання аваладвае планетай і дабіраецца да Беларусі. […]

Веганы – тыя самыя вегетарыянцы, якія не ўжываюць не толькі мяса і рыбу, але ўвогуле ўсе прадукты жывёльнага паходжання, у тым ліку яйкі, малако, а некаторыя адмаўляюцца таксама і ад мёду.

Слова «веганства» для азначэння адпаведных людзей распаўсюдзілася ў 40-х гадах XX ст. з той самай краіны, адкуль бярэ шлях сучасная мода на вузкія джынсы і музыку Indie. Тэарэтыкам субкультуры стаў заснавальнік Брытанскага Веганскага Таварыства Дональд Уотсан, які апісаў «немалочнае вегетарыянства». Сам Дональд нарадзіўся ў маленькім шахцёрскім гарадку, дзе наваколле ну ніяк не спрыяла выбару прадуктаў харчавання. Пасталелы, трыццацігадовы Дональд вырашаў жыць у згодзе з жывёламі і стаў веганам. А 1 лістапада 1944 года яшчэ і заснаваў першае ў свеце веганскае таварыства. Таму цяпер у гэты восеньскі дзень па ўсім свеце адзначаецца Дзень веганства. Пражыў Уотсан дарэчы 95 год.

У нашы дні веганы сталі не меншым трэндам, чым акуляры Рэйбан, або ровары-фіксы. Але каб трымацца новай моды на ежу, патрэбна куды болей высілкаў, чым у набыцці апошняй мадэлі гаджэтаў.

«Кожны веган мусіць падыходзіць свядома да гэтага пытання, – кажа Уладзімір, веган з пяцігадовым стажам. – У грамадстве існуе стэрэатып, калі захварэў звычайны чалавек, гэта ўспрымаецца нармальна, а калі веган захварэў нават на звычайную прастуду, некаторыя мяркуюць, што гэта абавязкова з-за формы харчавання». […]

Кожны веган сцвярджае, што адчувае сябе лепей з таго часу, як ужывае толькі прадукты расліннага паходжання. І яшчэ можа прывесці жменю іншых плюсоў веганства. Адна з самых старэйшых кніг, такая своеасаблівая біблія веганства *No Animal Food: Two Essays and 100 Recipes* (Лондан, 1910) апісвае тузін прычын быць веганам. Сярод іншага, аўтар кнігі Руперт Уэлдан прысвяціў яшчэ і цэлую главу эканамічным выгодам для дзяржавы.

Калі паглядзець на сучасную беларускую сельскую гаспадарку, то можна таксама знайсці некалькі аргументаў супраць жывёлагадоўлі. І рэнтабельнасць прадукцыі раслінаводства ў сярэднім вышэй за малочную і мясную, і цэны ніжэйшыя. Напрыклад, у 2012 годзе адна тона сырога мяса каштавала як дзевяць тон зерневых.

Але што да звычайнага пакупніка, то гэта досыць спрэчны момант, ці з’яўляецца веганскі лад жыцця больш танным. […]

generation.by

**Заданне 1.1. (0–1)**

**Пастаў тэзіс да тэксту.**

....................................................................................................................................

....................................................................................................................................

**Заданне 1.2. (0–1)**
**Адкажы сваімі словамі, чым паводле аўтара тэксту з’яўляецца веганства?**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 1.3. (0–2)**
**Праўда ці фальш? Пазнач згодна з інфармацыямі пададзенымі ў тэксце. Праўдзівыя інфармацыі пазнач (П), фальшывыя (Ф).**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Тэрмін “немалочнага веганства” з’явіўся ў Брытаніі больш за 60 гадоў таму. | **П** | **Ф** |
| **2.** | Тэарэтык веганства Дональд Уотсан, дзякуючы адпаведнаму харчаванню, дажыў да 95 гадоў. | **П** | **Ф** |
| **3.** | Веганы хутчэй за іншых падатны на хваробы. | **П** | **Ф** |
| **4.** | Веганства – найбольш строгая форма вегетарыянства, якая максімальна выключае ўжыванне прадуктаў, звязаных з эксплуатацыяй і забойствам жывёл. | **П** | **Ф** |

**Заданне 1.4. (0–2)**
**У якім стылі напісаны тэкст і якую выконвае функцыю?**

стыль – .............................................................................................................................

функцыя – .........................................................................................................................

**Заданне 1.5. (0–1)**
**Якія эканамічныя карысці з веганства бачыць аўтарка тэксту для Беларусі?**

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

.......................................................................................................................................

**Заданне 2.**

**Альгерд Бахарэвіч**

***ГАНАРОВАЯ ВЕШАЛКА***

(скарочана)

Смутна мне, Божа! Куды я ні гляну…

Гэта, калі што, Купала напісаў, а не я. Я б так не змог. Па-першае, таму што ён быў геній, а па-другое, на мне няма цяпер маёй сялянскай кашулі. Яе ў мяне, калі быць шчырым, зусім няма. Сорамна, канечне, у дваццаць першым стагоддзі не мець сялянскай кашулі ў гардэробе. Ці майтак з нацыянальным арнаментам. Можа, хто падорыць на 25 сакавіка… Ці на гадавіну перамогі пад Оршай. Хаця ёсць сумнеў, што яны там пад Оршай менавіта ў вышыванках маскалю прачуханца давалі. Але хто яго ведае, якім было сярэднявечнае хакі…[…]

А вышыванка? А яна акурат у трэндзе. Вось і маё любімае радыё абмяркоўвае, чаму гэта раптам вышыванка зноў у модзе. Этнаграфізм? Выклік нацыяналістаў? Унутраная патрэба? Салідарнасць з Украінай? Добра, калі толькі апошняе.

Здаецца, перадусім трыумф вышыванкі значыць, што ўсё было дарэмна. Мы прапалі. Вышыванчачная Беларусь зноў перамагла Беларусь еўрапейскую. Мы вярнуліся туды, дзе былі. Да Беларусі льняной, жытнёвай, баравой, а таксама баваўнянай, саматканай, паркалёвай, пладова-ягаднай і сінтэпонавай. Быць беларусамі без вышыванкі не атрымліваецца. […]. Нешта не складваецца. Але што?

Проста беларусам, без вышыванкі, быць нецікава. Беларускасць трэба насіць на сабе. І зашпільваць на ўсе гузікі. І пажадана да калена. Каб усе бачылі – вось ідзе беларус. Ці беларусачка. Сама цёмная, вусы белыя, а на грудзях – узор нацыянальны. Эцюд у белых і чырвоных тонах.

Навошта кніжкі чытаць, калі ёсць вышыванка? На ёй усё напісана, то бок вышыта. Ці намалявана, як тату на скуры. А больш беларусу ведаць неабавязкова. Мудрасці пакаленняў, запісаных беларускімі рунамі, хопіць, каб пражыць жыццё і іншых навучыць. Навошта кірыліца і лацінка, калі ёсць руны? Вышыванка – таксама цывілізацыйны выбар. Адмова ад Захаду і ад Усходу таксама – а замест гэтага рух углыб, у зямлю. Да нібыта глыбокіх – як магілы – народных традыцый. Толькі, на жаль, кожная традыцыя ёсць усяго толькі міфам. Апраўданнем голаду – гэтага вечнага спадарожніка людзей у вышыванках. Традыцыі выдумваюць тады, калі гэта робіцца выгодным. І забываюцца на іх адразу ж, як толькі яны пачынаюць замінаць.

Пакуль што па вуліцах беларускіх гарадоў людзі ў вышыванках яшчэ не бегаюць. Яны ў вышыванках пераважна пазіруюць. Трохі збянтэжаныя, яны пазіраюць у аб’ектыў і думаюць, што выглядаюць вельмі патрыятычна. Патрыятызм наогул – усяго толькі адна з формаў фотагенічнасці. Людзям у вышыванках вельмі важна адчуць, што іх шмат. Толькі тады яны моцныя. І ў гэтым нашае з імі адрозненне. Еўрапейцу важнае крыху іншае – адчуць сваю каштоўнасць і свабоду, застаўшыся самому, без грамады. У гэтым яго моц.

budzma.by

**Заданне 2.1. (0–1)**

**Да якога літаратурнага жанру адносіцца тэкст Альгерда Бахарэвіча *Ганаровая вешалка*?**

.............................................................................................................................................

**Заданне 2.2. (0–2)**

**Якую функцыю ў прадстаўленым тэксце выконвае:**

А. клічны сказ (*Смутна мне, Божа! Куды я ні гляну…*)

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

Б. пытальны сказ (*Навошта кніжкі чытаць, калі ёсць вышыванка?*)

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

**Заданне 2.3. (0–1)**

**Растлумач, што ў кантэксце тэксту значыць словазлучэнне *сялянская кашуля*.**

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

**Заданне 2.4. (0–1)**

**Якую функцыю, паводле аўтара тэксту, выконвае вышыванка ў сучасным грамадскім жыцці беларусаў?**

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

**Заданне 2.5. (0–1)**

**У сказах: *Толькі, на жаль, кожная традыцыя ёсць усяго толькі міфам. Апраўданнем голаду – гэтага вечнага спадарожніка людзей у вышыванках,* аўтар слова *голад* выкарыстоўвае ў пераносным значэнні. Як ты яго разумееш?**

...................................................................................................................................

...................................................................................................................................

**Заданне 3.**

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. Успаміны – крыніца шчасця ці суму? Абмяркуй праблему і абгрунтуй свой погляд. Звяртайся да ніжэй пададзенага фрагмента тэксту *Галя* Янкі Брыля, цэлага твора і іншага тэксту культуры. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

Янка Брыль

***Галя***
*(скарочана)*

Калісьці, пры панах, гэта быў хутар. […] Ад хутара застаўся толькі сад, скрыпучы журавель над зрубам студні і тая самая хата.

У хаце ад усёй Хамёнкавай сям'і ўцалела толькі нявестка Галя з дзецьмі, хлопцам і дзяўчынкай. […]

А трактар гудзе і гудзе... Не пакінеш яго, не забудзеш, што гэта − Сярожа, яе Сярожа... Божа мой, як гэта горка, балюча ад думкі такой!.. А ён жа быў яе, яна была − яго, яны так хораша, так многа цалаваліся. Ды не многа, а тыдзень адзін, а ў тыдні ж толькі сем начэй.

[…] Яна была наймалодшая ў іхняй дзявочай кампаніі. Сірата з самай беднай у Гаросіцы хаты Марылі Парабчанкі. […] На пашы дзеці лаялі яе брыдкім бязлітасным словам − байстручка. Ды з часам гэта слова абвалілася з яе, як шалуха. Прыгожай, спраўнай вырастала Галачка. […]

Гэта быў толькі ўступ да вялікага шчасця, што мела прыйсці, што пачалося ў тую ж ноч, калі ён цалаваў яе каля іхняга акна, а Галя закрывала твар рукамі і прасілася: «Сярожа, міленькі, не трэба...» [...]

І хто мог падумаць, што іх развітанне − навек!..

Цяпер вось стой ды слухай, як за пшаніцай, за вырваным ільном гудзе яго вясёлы працавіты трактар. Думай пра першую радасць сваю, крычы, звар'яцей ды крычы, каб успомніў цябе і прыйшоў.

[…] У верасні трыццаць дзевятага года, вярнуўшыся ў родную вёску, Сяргей адразу ж пачуў, што дзяўчына яго − за другім.

Як гэта сталася, што малады Хамёнак, Данькаў сын, узяў дачку Марылі Парабчанкі? […] Ён − закахаўся, відаць, так, што пайшоў супраць волі бацькоў. Ну, а на месцы Галі пайшла б за яго не адна. […]

Сама Галя ведала больш. Мікола лазіў за ёю даўно, яшчэ да Юрачкі. Гаворка пра арышт Сяргея і Галіны горкія слёзы былі днямі ягонай радасці. [...] Пра гэты замуж шчаслівы трубілі не толькі чужыя − і сваякі, і маці была на яго, Міколавым, баку... [...], − у свёкравым вечным зудзенні толькі і чуваць было: «Байстручка, жабрачка, няўдаліца...» […] Мікола здаваўся іншым за бацьку толькі раней, да вяселля. Тут, на хутары, калі яна пераступіла з ім парог гэтай чортавай ямы, − Хамёнак застаўся Хамёнкам. […]

У першы дзень пасля вяселля свякроў зварыла чыгун бульбы ў лупінах і з чыгуном паставіла на стале. […]

− Масла мо трохі растапі, − сказаў ён жонцы. [...] вярнулася з лыжкаю масла. Яго аказалася мала на ўсю скавародку. [...] Пайдзі ты, Галя, другую дзяружку вазьмі. Пойдзем, яшчэ разочак прынясём. Зімой лішні ахапак як знойдзеш. [...]

− Я ніколі не крала, − сказала яна. − Трэба вам, мала свайго, дык ідзіце. [...]

Гэта было напрадвесні сорак чацвёртага года. Нешта апоўначы Хамёнкавых разбудзіў стук у акно. Ясна − хто гэта: адны былі ў той час гаспадары начэй. [...] Сам гаспадар у такіх выпадках не ўставаў з пасцелі. [...]

− Добры вечар, Галя! І ты ад нас хаваешся?

Ах, ну чаму ты, дурніца, тады не сказала яму: «Забяры мяне, родны, адгэтуль!» Чаму не назвала яго тым іменем, якое даражэй табе за ўсе на свеце імёны, − Сярожа? Чаму?..[...]

Сядзь і сядзі каля акна. Хочаш − крычы, а хочаш − маўчы, пазірай. Ёсць і яшчэ адно, што табе засталося, − заплач.

[...] Галя ідзе па расе каля пшаніцы, туды, дзе дарога ў поле.

«Не, ён − не толькі спекулянт, − у думках гаворыць яна, нібы яшчэ ўсё размаўляючы з дачкой. − Ён − баязлівец, злосны, плюгавы, шкодны чалавек. Ён ніколі не быў тваім бацькам, дачушка мая, не быў маім мужам. Ніколі!..»

Яна ўспамінае яго бараду. [...]

Можа, нядобра гэта, што яна не шкадуе яго? То ж бацька дзецям, пражылі столькі год... Ды не, не шкадуе, ні разу нават, здаецца, і не падумала. А трактар гудзе... […]

Я. Брыль, *Галя* [у:] *Беларуская літаратура. Хрэстаматыя*, Мінск 2004, с. 638– 647.

**Тэма 2. Зрабі аналіз верша. Пастаў інтэрпрэтацыйны тэзіс і абгрунтуй яго. Твая праца павінна налічваць не менш чым 250 слоў.**

Наталля Арсеннева

***Уваскрэсні***

Ён уваскрос,
                    Ён – дзесь між намі,
Ён там, дзе ў срэбным пыле лоз,
у сіняй смузе над палямі
вісіць вясна...
                    Ён уваскрос.
Ускрос,
            і зноў па Беларусі
перад сабой ідзе Хрыстос...
Здымае з душ настылых вусціш,
багаслаўляе соладзь кроз,
сяліб раскіданых прысады,
муры нязлічаных вязніц
і тых,
          што пагублялі радасць
па кроплі кропля й дзень па дні...
Ідзе Хрыстос... Над Ім дугою
ўстае густы блакіт нябёс,

а ногі ў ранах незагойных
кладуць сляды на шэрань рос...
Дык прыпадзем
і вусны спалім
на тых слядох, што Бог Хрыстос
губляе, моўчкі йдучы ўдалеч,
бо Ён ускрос,
Ён уваскрос!
Няхай над родным папялішчам
усцяж галосіць нема лёс,
няхай крываваяць нас і нішчаць, –
ускрэсне Край,
бо й Ён ускрос!
Мацней за смерць,
за ўсё,
каханне
зямлі, дзе ад дзіцяці ўзрос...
Устань жа, ўстань,
ускрэсні сёння,
мой Край, як уваскрос Хрыстос!

1953

Н. Арсеннева, *Уваскрэсні* [у:] Ян Карчэўскі, *Сучасная беларуская літаратура*, *Падручнік па літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 3 класса сярэдніх школ*, Warszawa 2003, с. 248.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

**Tabelę wypełnia egzaminator!**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| rozprawka | A. | 0 – 3 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 6 – 9 – 12 | | |
| interpretacja | A. | 0 – 2 – 4 – 6 | | |
| | B. | 0 – 4 – 8 – 12 | | |
| | C. | 0 – 1 – 2 | | |
| | D. | 0 – 2 – 4 | | |
| | E. | 0 – 1 – 2 | | |
| | F. | 0 – 1 – 3 | | |
| | G. | 0 – 2 – 4 | | |
| | H. | 0 – 2 – 4 | | |

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***